Пугачева Н.А., магістрантка ФІДК
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – С.В.Зыгмантовіч,
канд. пед. навук, дацэнт

# ДЗЕЙНАСЦЬ ВІЦЕБСКАЙ АБЛАСНОЙ БІБЛІЯТЭКІ ІМЯ У.І. ЛЕНІНА ПА ФАРМІРАВАННІ БАЗ ДАНЫХ КРАЯЗНАЎЧАЙ ТЭМАТЫКІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна” ўтворана ў 1929 годзе, з’яўляецца навуковай ўстановай універсальнага профілю, буйнейшым у вобласці інфармацыйным, навукова-метадычным і бібліяграфічным цэнтрам, мае прыярытэтны напрамак работы - краязнаўства.

Сучасная краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі накіравана на адраджэнне, захаванне гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёна, духоўнае і патрыятычнае выхаванне насельніцтва. Яна характарызуецца высокімі тэмпамі ўкаранення камп’ютарных тэхналогій і праяўляецца праз стварэнне электронных інфармацыйных рэсурсаў краязнаўчага характару, прадстаўленых бібліяграфічнымі, камбінаванымі, панўнатэкставымі базамі дадзеных, а таксама электроннымі версіямі друкаванай прадукцыі.

Сёння бібліятэка ажыццяўляе фарміраванне 5 баз дадзеных, якія садзейнічаюць задавальненню краязнаўчых патрэбнасцяў карыстальнікаў, прадстаўляюць аператыўны доступ да неабходнай інфармацыі і далучаюць да вывучэння сваёй “малой” радзімы.

*Бібліяграфічная база дадзеных “Краязнаўчая літаратура”* (АБІС ALIS, 1997) з’яўляецца часткай электроннага каталога і прадстаўлена як ў лакальным доступе, так і сетцы Internet, выконвае функцыі службовага і чытацкага назначэння. БД уяўляе універасльную крыніцу звестак па любым пытанні вывучэння краю і ўключае бібліяграфічныя апісанні кніг, брашур, выяўленчых выданняў, картагарфічных выданняў, артыкулаў з кніг, зборнікаў, перыядычных выданняў. БД дазваляе фарміраваць штомесячны паказальнік літаратуры

“Віцебская вобласць”, а таксама ствараць іншую бібліяграфічную прадукцыю, разлічаную на розныя катэгорыі карыстальнікаў. Аб’ём БД на 1.01.10 г. складае 68430 запісаў, прадстаўленых на рускай, беларускай і замежнай мовах. Бліжэйшая перспектыва развіцця БД – рэтраспектыўны ўвод бібліяграфічных запісаў, якія адлюстраваны ў традыцыйнай краязнаўчай картатэцы “Віцебская вобласць”, што дазволіць на другасным узроўні максімальна поўна раскрыць не толькі фонд абласной бібліятэкі, але і будзе садзейнічаць доступу аддаленага карыстальніка да неабходнай інфармацыі.

*Камбінаваная база дадзеных “Памяць Віцебшчыны”* ўключае знамянальныя і памятныя даты, якія адлюстроўваюць найбольш важныя і значныя падзеі гісторыі, культуры, эканомікі горада Віцебска і Віцебскай вобласці, а таксама юбілейныя даты вядомых і знакамітых землякоў і дзеячаў, якія пакінулі значны след ў гісторыі і культуры рэгіёна. БД ствараецца з 2007 года на беларускай і рускай мовах і ўключае 1636 запісаў (2010). На аснове БД фарміруецца друкаванае выданне бібліятэкі “Каляндар знамянальных і памятных дат”, які прадастаўляецца ў фармаце PDF на афіцыйным сайце бібліятэкі. Праграмнае забеспячэнне дазваляе ўключаць у БД не толькі тэкставую інфармацыю, але і бібліграфічную, графічную, картаграфічную і інш.

Апошнім часам бібліятэка аддае прыярытэт фарміраванню камбінаваных БД, заснаваных на прынцыпах карпаратыўнага ўзаемадзеяння, што дазваляе выйсці на новы ўзровень у стварэнні ўласных інфармацыйных рэсурсаў, зменшыць працазатраты, забяспечыць эфектыўнае выкарыстанне.

Пачынаючы з 2007 года, сумесна з бібліятэкамі ЦБС Віцебскай вобласці, адбываецца фарміраванне *камбінаванай базы дадзеных “Прыдзвінскі край: гісторыя і сучаснасць”*, мэтай якой з’яўляецца пашырэнне доступа да інфармацыйных краязнаўчых рэсурсаў ў прасторы і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны Віцебскай вобласці. Падрыхтоўка рэсурса ажыццяўляецца на аснове каапераціі і каардынацыі паміж абласной і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

публічнымі бібліятэкамі вобласці. Адметнасцю БД з’яўляецца яе ўніверсальны змест, інтэграцыя інфармацыйных краязнаўчых рэсурсаў, магчымасць адлюстраваць найбольш значную літаратуру аб дадзенай тэрыторыі з частковым выкарыстаннем поўных тэкстаў артыкулаў з мясцовай перыёдыкі, а таксама выкарыстанне спасылак на сайты краязнаўчай тэматыкі. Пастраенне базы дазваляе ў перспектыве аб’яднаць ў адзінае цэлае электронныя краязнаўчыя рэсурсы не толькі бібліятэк вобласці, але і матэрыялы архіваў, музеяў, уласных калекцый краязнаўцаў, іншых устаноў і арганізацый, якія займаюцца вывучэннем і распаўсюджваннем інфармацыі па гісторыі краю.

Стварэнне *камбінаванай базы дадзеных “Мастакі Віцебскай вобласці”* ажыццяўляецца на аснове партнёрскага ўзаемадзеяння супрацоўнікаў аддзела літаратуры па мастацтве і мясцовай арганізацыяй Беларускага Саюза мастакоў. Работа па генерацыі БД пачалася ў 2006 годзе і прадугледжвае ўключэнне звестак пра жыццё і творчую дзейнасць мастакоў Віцебшчыны, фотаздымкаў работ аўтараў і бібліяграфічныя звесткі персанальнага характару. На сённяшні дзень у аддзеле назапашаны багаты матэрыял, які разнабакова асвятляе мастацкае жыццё Віцебшчыны. Наступным этапам стане перавод яго ў вызначаны фармат, распрацоўкая якога ўжо завершана.

Доступ карыстальнікаў да *паўнатэкставай электроннай калекцыі “Витебщина: документальное наследие”* стаў магчымы, дзякуючы супрацоўніцтву з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі (НББ). Сёння НББ у рамках рэалізацыі дзяржаўнай праграмы “Памяць Беларусі” праводзіць алічбаванне старадрукаваных і рэдкіх выданняў, якія з’яўляюцца часткай гісторыка-культурнай спадчыны краіны. У выніку пошукавай работы сектара краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Віцебскай абласной бібліятэкі, акая ажыццяўлялася на аснове рэтраспектыўнага паказальніка “Кніга Беларусі. 1517-1917. Зводны каталог” (1986), быў выяўлены масіў рэдкіх выданняў XIX – пачатку XX стст. аб Віцебшчыне, што адсутнічалі ў фондах абласной бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку алічбаваныя НББ дакументы па Віцебскай губерні (акрузе, вобласці) сталі асновай фарміравання электроннай калекцыі і на перыяд 1 сакавіка 2010 года склалі больш 450 назваў выданняў.

Электронныя рэсурсы, ствараемыя бібліятэкай, садзейнічаюць задавальненню і фарміраванню інфармацыйных патрэбнасцей па краязнаўству, актывізацыі краязнаўчай навуковай, практычнай, вучэбна-выхаваўчай, асветніцкай і іншым відам дзейнасці па захаванні сацыяльна-культурнай памяці ў рэгіёне.

Выкарыстанне электронных краязнаўчых рэсурсаў ў практычнай дзейнасці павышае паўнату, дастаўернасць і якасць інфармацыйнага і бібліяграфічнага абслугоўвання, а таксама дазваляе атрымаць непасрэдны доступ да матэрыялаў, неабходных карыстальніку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ